УДК 930.85(476)

# ВОБРАЗ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ, УВАСОБЛЕНЫ Ў КАМЕНІ І БРОНЗЕ

***Сяргей Марозаў***
*Гродна, Беларусь*

Раскрываецца гісторыя ўшанавання памяці Францыска Скарыны ў Беларусі і за мяжой шляхам манументальнай скульптуры на працягу 1974–2017 гадоў. Прыводзіцца інфармацыя пра стварэнне і ўсталяванне помнікаў Скарыне ў Полацку, Лідзе, Мінску і іншых гарадах і краінах. Помнікі разглядаюцца як транслятары сацыяльна-значнай інфармацыі пакаленням людзей.

***Ключавыя словы: беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, ушанаванне, манумент, эмацыянальнае гучанне, гістарычная памяць.***

Памяць пра беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара была ўшанавана ўдзячнымі нашчадкамі ў XX – пачатку XXI ст. рознымі шляхамі і ў розных краінах свету. Вучоныя прысвяцілі яму шматлікія даследаванні, навуковыя мерапрыемствы, надрукавалі яго аўтарскія творы і выдалі яго кніжную спадчыну. Пісьменнікі і паэты ўславілі яго ў прозе і вершах. Пра яго знялі фільмы, паставілі спектаклі. У гонар Францыска Скарыны створаны музеі, названы высокія дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі, зладжаны святы і выставы. Яго імя трывала ўвайшло ў нашу тапаніміку. Сродкамі жывапісу вобраз Ф. Скарыны асэнсоўвалі многія майстры пэндзаля. Скульптары ўсталявалі яму помнікі. Пра апошнія – гэты артыкул.

Расійскі філосаф І. Г. Краўчанка трактуе помнік як сацыяльны феномен, які выконвае ролю транслятара сацыяльна-значнай інфармацыі і з'яўляецца звязуючым звяном паміж цывілізацыямі, грамадскімі структурамі, пакаленнямі людзей. Помнікі з'яўляюцца часткай гісторыка-культурнага набытку краіны, нацыі. Яны валодаюць стабілізуючай функцыяй у грамадстве і з'яўляюцца крыніцай фарміравання індывідуальнай гістарычнай свядомасці. Навукай устаноўлены ўзаемаўплыў паміж эмацыйна-эстэтычнай насычанасцю помніка і яго даўгалеццем [1].

Першы ў свеце манумент Францыску Скарыну быў узведзены ў **Полацку** – горадзе, дзе ён пачаў свой жыццёвы шлях. Мадэль гэтага манумента стварыў у 1967 г. скульптар, народны мастак БССР Аляксей Канстанцінавіч Глебаў, які шмат гадоў працаваў над помнікам беларускаму перашдрукару. Адліць скульптуру з бронзы ён не паспеў. За яго гэта зрабілі яго вучні Ігар Глебаў і Андрэй Заспіцкі. Помнік ў 1974 г. адлілі ў Ленінградзе на заводзе «Манументальная скульптура» і ў тым жа годзе ўсталявалі ў самым цэнтры Полацка.

Ужо пятае дзесяцігоддзе 5,5 метровая бронзавая фігура асветніка на высокім (6,5 м) гранітным пастаменце ўпрыгожвае плошчу Францыска Скарыны. Агульная вышыня манумента – 12 м. Ён добра ўпісаны ў гарадскі пейзаж. У глыбокім роздуме глядзіць на нас беларускі інтэлектуал першай паловы XVI ст. Манументальна-урачысты і ў той жа час такі просты і ясны па кампазіцыі помнік мае моцнае эмацыянальнае гучанне. Выразны сілуэт, гарманічныя і ўраўнаважаныя формы ў трактоўцы фігуры. Гістарычную канкрэтнасць вобразу надае адзенне XVI ст. У 1976 г. скульптару Аляксею Глебаву за гэты помнік пасмяротна была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.

Помнік стаў элементам нашай гістарычнай памяці, нацыянальнай каштоўнасцю, а як знак удзячнасці палачан іх знакамітаму земляку – звязуючым звяном паміж пакаленнямі людзей. Ён транслюе сацыяльна значную інфармацыю, фарміруе гістарычна канкрэтную індывідуальную свядомасць, валодае стабілізуючай функцыяй у грамадстве. Вось яна гісторыя, якая нас аб'ядноўвае.

Полесгу

Мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя Францыску Скарыну, работы маладога беларускага скульптара Валер'яна Янушкевіча былі ўстаноўлены ў 1991 г. у польскім **Кракаве**, а ў 1992 г. – у італьянскай **Падуі.**

Першы помнік Францыску Скарыну ў незалежнай Беларусі з'явіўся ў 1993 г. Першая адкрыла помнік новага беларускага часу **Ліда**.

Чаму Ліда? На падставе розных дакументаў вучоныя сцвярджаюць, што да канца XVI ст. шлях зносін паміж Кракавам і Вільняй ляжаў праз Ліду – Слонім – Берасце. А, значыць, зусім верагодна, што Ф. Скарына ехаў вучыцца з Полацка ў Кракаў старадаўнім гасцінцам праз Ліду, а таксама ім жа пазней вяртаўся з Прагі і Кракава ў Вільню. Да таго ж Ліда заўсёды была значным культурным і эканамічным цэнтрам на беларускай частцы Віленшчыны – зямлі, дзе ў 1522 г. убачыла свет «Малая падарожная кніжка» – першая друкаваная кніга на сучаснай тэрыторыі Беларусі, Украіны і Расіі.

З прапановаю ўстанавіць у Лідзе помнік знакамітаму беларусу, які з'яўляецца гонарам нашай нацыі і дзяржавы, выступіла яшчэ ў канцы 1989 г. Лідская гарадская рада Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Яна звярнулася да кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, кааператыўных гаспадарак, грамадскіх і рэлігійных арганізацый, першасных суполак Таварыства беларускай мовы, усіх грамадзян, неабыякавых да лёсу беларускай мовы, унесці свой уклад на адкрыццё помніка Ф. Скарыну на плошчы імя 600-годдзя Ліды.

Была распачата акцыя па збору сродкаў на збудаванне помніка. Гэта справа атрымала шырокую падтрымку грамадскасці, а пасля – і ўладных структур. Вялікія па тых часах грошы пералічылі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі аблвыканкам, Лідскі гарвыканкам.

Хоць не ўсе адразу ўспрынялі гэту прапанову – на старонках лідскай газеты на працягу трох гадоў нават разгортвалася цэлая дыскусія. Некаторыя пісалі: «Навошта нам гэтыя помнікі?»; навошта ўвогуле культура – «трэба жылля і каўбасы». Былі і такога роду разважанні: маўляў, Ліда – горад малы і бедны, у яго не хопіць грошай фінансаваць гэту дарагую справу і таму няма патрэбы ў пампезнасці. Раздаваліся пытанні: якое дачыненне мае Ф. Скарына да Ліды – якая неабходнасць ва ўсталяванні яму помніка менавіта ў Лідзе? Ці дадасць архітэктурнай гармоніі гістарычнаму цэнтру горада чатырохметровая бронзавая фігура першадрукара? Так разважалі не персанальныя ворагі Ф. Скарыны, але праціўнікі ўсяго беларускага, любой праявы беларушчыны – каму б помнік не ставілі, яны б выступілі супраць [2].

Але ўрэшце запанавала разуменне значнасці гэтага аб'екта для Ліды. Зразумелі, што пытанне аб устаноўцы ў горадзе помніка Ф. Скарыну мае больш маральнае значэнне, чым матэрыяльнае. Памяць аб ім увекавечваюць людзі ў далёкай Італіі, у Падуі, у Кракаве, а мы забываем свайго земляка на тэрыторыі, дзе ён друкаваў кнігі. Няўжо большыя адносіны меў да Ліды, напрыклад, Ф. Энгельс, чыё імя ўвекавечана ажно ў адной доўгай вуліцы і чатырох завулках?

Прыйшло разуменне, што мы жывем не толькі ў геаграфічным, але і ў пэўным культурным асяроддзі, якое нас выхоўвае. Культура неабходна для маральнага жыцця чалавека, для яго прывязанасці да свайго краю, сваіх продкаў, да сваёй гісторыі. Таму неабходнасць устялявання помніка Ф. Скарыну ў Лідзе не падлягае самаму малому сумненню. Гэты помнік будзе паказчыкам узроўню духоўнага жыцця лідзян, узроўню іх адукаванасці, гістарычнай свядомасці і г. д. Толькі заклікамі і абяцаннямі патрыятызм нельга выхаваць. Устанаўленне помніка вялікаму асветніку эпохі Адраджэння – гэта нашы канкрэтныя дзеянні па адраджэнні гонару за свой народ, наш канкрэтны ўклад у адраджэнне суверэннай Беларусі.

Тады, у 1992–1993 г. замову лідзян на выраб помніка выканаў мінскі скульптар Валер'ян Янушкевіч. Праект прывязкі помніка да мясцовасці распрацаваў малады лідскі архітэктар Ю. Бірукоў, непасрэднай устаноўкай займаўся архітэктар Рычард Груша.

За два тыдні да адкрыцця помніка стала вядома, што ёсць праблемы. Камень, які падрыхтавалі пад пастамент, аказаўся з трэшчынай. За тыдзень да ўстаноўкі пры

апрацоўцы ў Мінску ён лопнуў. Давялося на ходу ўсё мяняць, ехаць на Украіну, замаўляць і купляць гранітныя пліты, везці цераз дзяржаўную мяжу, заліваць бетонны маналіт і аздабляць плітамі. У апошнія чатыры дні перад адкрыццём помніка рабочыя працавалі да самага цямна. Праца ішла і ў апошнюю ноч. З самага ранку выконвалі апошнія работы: чысцілі, мылі, падмалёўвалі, надаючы помніку годны выгляд. Вакол помніка пасыпалі чырвоную крошку, што здабываецца з бітай цэглы [2].

Скульптура размешчана на ажыўленым месцы горада, у скверы паблізу Фарнага касцёла на шырокім пастаменце, выкананым з граніту. Мастакоўская задума вырашана мудра і проста: пастава першадрукара – трохметровая бронзавая постаць у рост; яго адзенне, як і ўвесь помнік, – у рэнесансавым стылі; знешняе аблічча Ф. Скарыны мае падабенства з яго шырокавядомым гравюрным партрэтам 1517 г. Твор выкананы ў рэалістычных традыцыях і вылучаецца адухоўленасцю, глыбокім псіхалагізмам. Велічны, спакойны, з надзеяй і спадзяваннем у вачах Ф. Скарына пазірае на нас з пастаменту і нібы гаворыць: «Бярыце і чытайце». Ён «вярнуўся» ў Беларусь, як і некалі неадольна вяртаўся на радзімую зямлю, каб падараваць сваім землякам асалоду чытання, радасць ведаў, шчасце асветы.

Такога свята, якое адбылося 25 ліпеня 1993 г., старажытная Ліда, мабыць, не ведала за ўсю сваю папярэднюю шматсотгадовую гісторыю. Урачыстасці, прысвечаныя Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь і адкрыццю помніка Ф. Скарыну, вызначалася яскравым нацыянальным зместам, адметным і выразным беларускім духам.

Ва ўрачыстасцях бралі ўдзел міністр замежных спраў, удзельнікі першага з’езду беларусаў свету, вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук. Тысячы людзей са святочным настроем з хваляваннем чакалі моманту, калі з манумента спадзе белае покрыва. Яго сцягваюць Валеры Янушкевіч, Рычард Груша і Міхась Мельнік – старшыня Лідскай гарадской рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны.

У святле яркіх пражэктараў перад прысутнымі ва ўвесь рост паўстае постаць тытана беларускага і еўрапейскага Адраджэння. Раздаюцца бурныя апладысменты, гучыць громкае «Ура!» Грыміць салют і неба расцвітае каляровым феерверкам. Льюцца прыгожыя мелодыі камернага хору. Да падножжа помніка ўскладваюцца кветкі. Сотні людзей запальваюць свечкі, і ўжо не стрымаць іх рух да манумента. Свечкі і ружы – цяпло і падзяка, адданасць [2].

Адкрыццё ў 1993 г. у Лідзе помніка першадрукару ўсходніх славян – вялікая падзея ў жыцці не толькі горада, але і ўсёй нашай Бацькаўшчыны. Першы помнік у незалежнай Беларусі – ён надаў культурнаму жыццю Ліды новае вымярэнне.

Сённяшнія лідзяне ганарыцца тым, што першымі ў суверэннай Беларусі збудавалі помнік Ф. Скарыну; урачыста адзначаюць гадавіны яго ўсталявання: дзесятую, дваццатую. Помнік-прыгажун, які ўжо амаль чвэрць стагоддзя красуецца ў цэнтры горада, яго ўпрыгожвае, стаў разам з замкам XIV ст. гістарычным брэндам горада і ўславіў яго далёка па-за межамі нашай краіны [2; 3].

Францыск Скарына нібы вітае Ліду, нагадваючы ёй пра былое, пра багатую гістарычную спадчыну. Гэты помнік увайшоў у наш лёс, каб новым пакаленням беларусаў казаць: «...Ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, знаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобнае бароняць вулляў сваіх; тако ж і людзі – дзе нарадзіліся і ўскормленыя суць па Бозе, да таго месца вялікую ласку ймаюць».

Першы ў **Мінску** і самы незаўважны для шырокай публікі помнік Ф. Скарыну стаіць ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сярод пантэона скульптур нашых слынных гістарычных асоб. Помнік быў падораны БДУ ў 1999 г. мінскім грамадска-асветным аб’яднаннем «Спадчына». Яго аўтар – скульптар Сяргей Адашкевіч.

Традыцыя ўзвядзення помнікаў ва дварах універсітэтаў мае шмятвяковую гісторыю. Сёння – гэта яшчэ і даніна модзе. БДУ – першы нацыянальны ўніверсітэт

Беларусі – з’яўляецца прадаўжальнікам навуковых, адукацыйных і культурных традыцый, закладзеных нашымі знакамітымі асветнікамі. Таму не дзіўна, што першы ў сталіцы помнік Ф. Скарыну быў устаноўлены ля галоўнай ВНУ Беларусі. Ён знаходзіць тут сваіх гледачоў і шанавальнікаў. Сярод студэнтаў існуе павер’е, што калі перад экзаменам падысці да помніка Ф. Скарыну і папрасіць яго аб «яснай галаве» і паспяховай здачы, дык праблем з экзаменам не будзе.

Але, несумненна, асветнік заслугоўваў больш велічны помнік у беларускай сталіцы. І стаяць ён павінен навідавоку, каб бачылі не толькі студэнты.

Яшчэ ў 1990 г., калі споўнілася 500 гадоў з дня нараджэння Ф. Скарыны, ЮНЕСКА аб’явіла святкаванне гэтага юбілею ва ўсім свеце. У сувязі з гэтым у **Мінску** быў абвешчаны конкурс на лепшы праект помніка Ф. Скарыну, які меркавалася ўстанавіць ля каланады перад будынкам Акадэміі навук Беларусі. На конкурс было пададзена больш за 10 праектаў. Перамог скульптар Алесь Дранец. Яго праект звярнуў на сябе ўвагу сваёй дасканаласцю.

У 1990 г. па яго праекту адлілі з бронзы дзевяціметровы помнік (шэсць – фігура, тры – гранітны пастамент). Аднак кіраўніцтва Акадэміі навук, дзе планавалі ўстанавіць помнік, адмовілася ад яго. А іншага прыдатнага месца не знайшлі. Так і пыліўся помнік недзе ў загашніках, пакуль у 2005 г. не пабудавалі Нацыяналью бібліятэку [4]. Прапанову устанавіць ля яе помнік зрабіў Прэзідэнт Беларусі А. Р. Лукашэнка.

З’яўленне Ф. Скарыны перад Нацыянальнай бібліятэка вельмі сімвалічнае. Калі б не ён, кнігадрукаванне на беларускія землі магло б прыйсці на дзесяткі гадоў пазней.

Велічны помнік першадрукару захоўвае залацісты колер бронзы. Ён адразу трапляе на вочы кожнаму, хто падыходзіць да бібліятэкі. Манумент успрымаецца цэласна з рэльефамі яе фасада і глядзіцца ў гэтым месцы настолькі гарманічна, нібы першапачаткова ён і ствараўся для ўстаноўкі менавіта тут.

Мастакі, якія афармлялі ўваходныя «крылы» ў бібліятэку, умела ўвязалі іх з помнікам Ф. Скарыну і змаглі стварыць арганічны дыялог паміж сучаснай мовай архітэктуры і сімволікай беларускай мінуўшчыны. Пасля доўгіх пошукаў яны знайшлі кампазіцыю з фрагментам сусвету, як яго ўяўлялі ў XVI ст., тым больш што сам Скарына займаўся астраноміяй, з выявамі Скарынавых знакаў – месяца і сонца, і фразу са скарынавай Біблії: «Да совершенен будет человек божий», якую пераклалі на 18 моваў свету [5, С. 6–7].

Ад першай кнігі да Нацыянальнай бібліятэкі – такі шлях «прайшоў» слаўны палачанін.

Доўгі час Ф. Скарына жыў і працаваў у **Празе.** Тут ён у 1517 г. надрукаваў першую беларускую кнігу. Тут жа, па меркаванні некаторых гісторыкаў, ён і пахаваны. Таму не дзіўна, што ў пражскім раёне Градчаны помнік Ф. Скарыну быў пастаўлены яшчэ ў 1996 г. Вышыня яго разам з гранітным п’едэсталам складае больш за два с паловай метры. Побач са статуяй ляжыць валун, які разам з помнікам прывезлі з Мінска. На бронзавым лісце, прымацаваным да валуна, на беларускай і чэшскай мовах напісана пра дзейнасць Ф. Скарыны ў Празе.

У Празе акрамя помніка ёсць мемарыяльная шыльда нашаму земляку. Яна ўсталявана ў двары самай старой бібліятэкі – Клеменцінума. Тэкст на беларускай і чэшскай мовах гаворыць: «У 1517–1519 гадах у Старым Месцы выдатны беларускі навуковец Францыск Скарына аддрукаваў сваю першую Біблію на беларускай мове».

У 2004 г. Ф. Скарына «пасяліўся» ў **Калінінградзе.** Помнік першадрукару Рэспубліка Беларусь падаравала Расійскаму дзяржаўнам ўніверсітэту імя Імануіла Канта. Аўтар манумента – беларускі скульптар Міхаіл Арцімовіч.



ПолесГУ

Ф. Скарына быў у Кенігсбергу ў 1530-я г. па запрашэнню герцага Альбрэхта, які цікавіўся яго выдавецка-асветніцкай дзейнасцю. Герцаг пісаў: «Звярнуўшы ўвагу, як на яго сапраўдны і дзіўны талент, так і найвышэйшае майстэрства, якое ён дэманструе з дзіўным бляскам і дасведчанасцю, мы міласціва ўпісалі яго ў лік і кола нашых падданых і верных мужоў і адносім яго да шэрагу тых, да каго заўсёды ставімся з прыхільнасцю» [6].

Помнік устаноўлены перад будынкам Калінінградскага ўніверсітэта на пастаменце, абліцаваным чырвонай пліткай, і ўяўляе сабой фігуру асветніка, які сядзіць на вялізным камяні. У адной руцэ ён трымае вялікі кій, другая рука ляжыць на сумцы, апранутай праз плячо. Надпіс на помніку гаворыць: «Удзячныя нашчадкі вялікаму славянскаму асветніку беларускаму першадрукару». Гэтым манументам адзначаны ўклад Ф. Скарыны ў развіццё культуры славянскіх народаў.

У сталіцы Літвы **Вільнюсе** ўстаноўлена мемарыяльная дошка на будынку па вуліцы Дыджэйі, 19, дзе, мяркуецца, у XVI ст. змяшчалася друкарня Ф. Скарыны і пачалася гісторыя кнігадрукавання ў Вялікім Княстве Літоўскім. Ва ўнутраным двары гэтага будынку яшчэ ў 1973 г. быў устаноўлены помнік «Летапісец», які можна разглядаць як помнік друкарні Ф. Скарыны і друкарні братоў Мамонічаў, што змяніла на гэтым месцы майстэрню першадрукара.

У 2011 г. беларусы ў **Вільні** выступілі з ініцыятывай аб узвядзенні ў Вільні помніка Ф. Скарыну у сувязі з набліжэннем 525-х угодкаў з дня яго нараджэння. Свой зварот да тагачаснага мэра Вільні і беларускага амбасадара ў Літве яны матывавалі тым, што менавіта тут Ф. Скарына даў жыццё першаму друкаванаму слову на нашай зямлі і гэтым праславіў Вільню, а разам з ім і ўсё Вялікае Княства Літоўскае. Веліч і сіла духу Ф. Скарыны, як гаварылася ў звароце, яго жыццёвы подзвіг прызнаны ва ўсім свеце. Яго імем названы вуліцы і праспекты, навучальныя ўстановы і бібліятэкі, грамадскія арганізацыі. Імя Ф. Скарыны прысвоена малой планеце № 3283 Сонечнай сістэмы. І такой выбітнай асобе эпохі станаўлення духоўнай культуры Новага часу ў Заходняй, Цэнтральнай, Паўночнай і Усходняй Еўропе, у тым ліку ў Вялікім Княстве Літоўскім, як Францыск Скарына, у Вільні таксама павінен стаяць помнік. Тым больш, што Вільня – адзін з нешматлікіх гарадоў, з якім так цесна павязаны яго лёс і ў гісторыі якога ён пакінуў такі глыбокі след [7].

У лістападзе 2017 г. помнік-бюст беларускага першадрукара плануецца ўстанавіць у Кішынёве, насупраць пасольства Беларусі ў Малдове**.** Яго выканаў скульптар Генадзь Лойка. Скульптуру вышынёй амаль 1 метр адліюць на скульптурным камбінаце Беларускага саюза мастакоў. Яе ўсталююць на пастаменце, які выкананы ў Кішынёве. Агульная вышыня помніка складзе крыху больш за 2,5 метры [8].

Каштоўнасць помнікаў Ф. Скарыну, усталяваных ў розных гарадах і краінах Еўропы, вызначаецца ступенню значнасці скарынаўскай спадчыны для культуры Беларусі і іншых еўрапейскіх народаў. Гэтыя манументы і мемарыяльныя шыльды ўвекавечваюць постаць і справы аднаго з найвялікшых дзеячаў гісторыі Беларусі, аднаго з найбольш адукаваных людзей свайго часу, які стварыў першую на тэрыторыі Ўсходняй Еўропы кнігавыдавецкую майстэрню і ў ёй выдаваў кнігі, што з’яўляюцца ўзорам гуманізму, маральнасці і перадавой навуковай думкі свайго часу.

Усталяваныя ў месцах, гістарычна звязаных з жыццём і дзейнасцю Ф. Скарыны, гэтыя помнікі перадаюць дух яго часу, але лагічна ўпісваюцца ў рэаліі сённяшняга дня. Транслюючы наступным пакаленням сацыяльна-значную інфармацыю, манументальная скульптурная скарыніяна з’яўляецца важнай крыніцай фарміравання гістарычнай памяці беларускага грамадства. Гледзячы на гэтыя манументы, зведваеш пачуццё гонару за сваю зямлю, продкаў, гісторыю, за сваю культуру і мову.



Полесгу

Помнікі Ф. Скарыне, узятыя ў сукупнасці, складаюць цэлы пласт нашай нацыянальнай культуры, сталі важнай часткай гісторыка-культурнага набытку краіны, дадаюць еўрапейскасці беларускім гарадам. Помнікі і мемарыяльныя шыльды знакамітаму беларусу ў іншых краінах ёсць сімвалам яго вялікага ўкладу ў еўрапейскую культуру. Яны годна прэзентуюць Беларусь на міжнароднай арэне, робяць яе ўсё больш пазнавальнай у свеце.


1. Кравченко, И. Г. Памятник как социальный феномен : дис.... канд. филос. наук [Электронны рэсурс] / И. Г. Кравченко. – Волгоград, 2008. – 137 с. – Рэжым доступу: http://www.dslib.net/soc-filosofia/pamjatnik-kak-socialnyj-fenomen.html. – Дата доступу: 25.10.2017.
2. Груша, Р. Ліда – горад Скарыны. Да 10-годдзя ўстаноўкі ў Лідзе помніка Францішку Скарыну [Электронны рэсурс] / Р. Груша. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/city_district/education/skaryna/Да_10-годдзяў_помніка_Францішку_Скарыну_ў_Лідзе.html. – Дата доступу: 25.10.2017.
3. Грынкевіч, Я. Скарынаўскае свята ў Лідзе [Электронны рэсурс] / Я. Грынкевіч. – Рэжым доступу: http://tbm-mova.by/news_549.html. – Дата доступу: 25.10.2017.
4. Помнік Францыску Скарыне ў Мінску [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vetliva.by/tourism/what-to-see/pamyatnik-frantsisku-skorine-v-minske/. – Дата доступу: 25.10.2017.
5. Шаранговіч, Н. Свята паяднанасці / Н. Шаранговіч // Мастацтва. – 2005. – № 9. – С. 6–10.
6. Скарына "пасяліўся" ў Калінінградзе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pawet.net/ns/2005/07/%E2%84%96_7_(693).html. – Дата доступу: 25.10.2017.
7. Прапанова аб узвядзенні ў Вільні помніка Францішку Скарыне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vilnia-by.com/archives/2398. – Дата доступу: 25.10.2017.
8. Помнік Францыску Скарыну ў Кішынёве будзе ўсталяваны ў лістападзе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20170724/1500900734-pomnik-francysku-skarynu-u-kishynyove-budze-ustalyavany-u-listapadze. – Дата доступу: 25.10.2017.


Полесгу